Падтрымай "Вясну" на PATREON

Паручыцеляў праваабаронцаў Граблеўскага і Драздоўскага прымусілі плаціць

06.11.2021 **Тэгі**: крымінальны пераслед, праваабаронцы

5 лістапада суддзя суда Партызанскага раёна горада Мінска **Міхаіл Макарэвіч** правёў пасяджэнне над чатырма паручыцелямі праваабаронцаў **Сяргея Драздоўскага** і **Алега Граблеўскага.**



Сяргей Драздоўскі (злева) і Алег Граблеўскі

У выніку рашэннем суда накладзены грашовыя спагнанні: у дачыненні да двух паручыцелей Сяргея Драздоўскага — **па 100 базавых велічынь (2 900 беларускіх рублёў)**, а ў дачыненні да двух паручыцелей Алега Граблеўскага — **200 базавых велічынь (5 800 беларускіх рублёў) і 250 базавых велічынь (7 250 беларускіх рублёў)**. Гэтае рашэнне можа быць абскарджана цягам 10 дзён.

Вядома, што суддзя спытаў у паручыцелькі Алега Граблеўскага, чаму яна вырашыла падпісаць паручальніцтва.

> *“Таму што Алег — харошы чалавек”,* — адказала яна.
>
> *“Вы і цяпер так лічыце?”* — спытаў суддзя.
>
> *“Так”.*



Сяргей Драздоўскі — дырэктар Офіса па правах людзей з інваліднасцю, а Алег Граблеўскі — юрыст Офіса. Абодвух затрымалі трэцяга лютага 2021 года. Алега Граблеўскага змясцілі ў СІЗА-1, а Сяргея Драздоўскага — пад хатні арышт. Праваабарончая супольнасць прызнала іх палітычнымі зняволенымі.

Пасля амаль паўгадавога зняволення Драздоўскаму і Граблеўскаму змянілі меру стрымання — і яны былі вызваленыя 31 ліпеня 2021 года пад асабістае паручальніцтва. Згодна з артыкулам 121 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса РБ, асабістае паручальніцтва заключаецца ў прыняцці на сябе асобамі пісьмовага абавязацельства аб тым, што падазраваныя або абвінавачаныя, знаходзячыся на волі, не схаваюцца ад органа крымінальнага пераследу і суда, не будуць перашкаджаць расследаванню справы або разгляду яе судом і не будуць займацца злачыннай дзейнасцю. У публічным доступе інфармацыі аб тым, што Драздоўскі і Граблеўскі знаходзяцца ў вышуку, няма.



Паўгадавы адпачынак? Праваабаронца Сяргей Драздоўскі распавёў, як яму жылося пад хатнім арыштам

Амаль паўгода праваабаронца Сяргей Драздоўскі правёў пад хатнім арыштам. 31 ліпеня стала вядома, што меру стрымання ў дачыненні да яго змянілі — цяпер ён пад падпіскай аб нявыездзе, дзейнічае паручальніцтва. Гэта азначае, што Драздоўскі можа свабодна выходзіць з дому, кантактаваць з людзьмі і карыстацца інтэрнэтам — усяго гэтага ён быў пазбаўлены. Праваабаронца распавёў "Вясне" аб тым, як для яго выглядаў хатні арышт.



"Фактычна яны былі затрыманыя за супрацоўніцтва з ААН". Што вядома пра справу "Офіса па правах людзей з інваліднасцю"?

Затрыманыя прадстаўнікі Асветніцкай праваабарончай установы "Офіс па правах людзей з інваліднасцю", дырэктар Сяргей Драздоўскі і юрыст Алег Граблеўскі. Перад гэтым Дэпартамент фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю ў сябе на сайце паведаміў, што праводзіцца праверка ў дачыненні да службовых асоб установы "Офіс па правах людзей з інваліднасцю" па пытаннях "магчымага неправамернага завалодання грашовымі сродкамі, атрыманымі ўстановай у выглядзе дабрачынных узносаў і міжнароднай дапамогі для мэт аказання дапамогі грамадзянам з інваліднасцю". "Офіс" на працягу дзесяці гадоў аказваў бязвыплатную прававую дапамогу, адвакатаваў змены заканадаўства, праводзіў асветніцкія мерапрыемствы па змене стаўлення да людзей з інваліднасцю.

Твитнуть



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брасце і Віцебску пасля рэйда па сацсетках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY